УДК 392.1(476.2)

К. В. Уніятава

Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар

# РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ БЕЛАРУСАЎ (НА МАТЭРЫЯЛАХ ФАЛЬКЛОРУ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

У артыкуле характарызуюцца абрады і звычаі, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Карыстаючыся апублікаванымі матэрыяламі па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Гомельшчыны і ўласна запісанымі звесткамі ад жыхароў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці, аўтар засяроджвае ўвагу на прыкметах і павер‟ях, звязаных з цяжарнасцю жанчыны і нараджэннем дзіцяці, асобных рытуалах хрэсьбіннага застолля, якія дапамагаюць асэнсаваць светапогляд нашых продкаў, зразумець семантыку абрадавых дзеянняў, звязаных з нараджэннем немаўляці і яго далучэннем да соцыуму.

Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў – той від традыцыйнай культуры беларусаў, які адрозніваецца не толькі захаваннем архаічных элементаў, але і вылучаецца ў найбольшай ступені адметнымі народнымі маральна-этычнымі ўстаноўкамі, правіламі, выпрацаванымі на працягу многіх стагоддзяў. Выкананне рытуалаў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці было скіравана на захаванне здароўя дзіцяці і яго далучэнне да сям'і, грамадскага жыцця. Даследчыкі вылучаюць некалькі перыядаў у радзіннахрэсьбінным абрадавым комплексе. Першы - перыяд цяжарнасці жанчыны, увага якой была спрадвеку скіравана на тое, каб нарадзіць здаровае дзіця. Другі перыяд, звязаны з родамі жанчыны-парадзіхі, суправаджаецца рытуаламі, якія звычайна выконвае бабка-павітуха, а таксама прыкметамі і павер'ямі. Пасляродавы перыяд адзначаны тымі абрадавымі дзеяннямі, выкананне якіх павінна было забяспечыць усталяванае традыцыямі прыняцце немаўляці не толькі ў сям'ю, але і яго паўнавартасныя ўваходзіны ў грамадскае жыццѐ. Прапанаванае даследаванне грунтуецца як на ўласных запісах звестак, зробленых у в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці, так і на фактычных матэрыялах, прадстаўленых у кнізе «Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці)» [1]. Фалькларыстыка 270 Разгледзім на асобных прыкладах, якімі прадпісаннямі павінны былі кіравацца жанчыны падчас цяжарнасці. Усе тыя забароны і засцярогі для жанчыны – гэта не што іншае, як спосаб папярэдзіць непажаданыя для будучага здароўя немаўляці фізічныя або маральнапсіхалагічныя пашкоджанні, каб забяспечыць лѐгкія роды: «Беременной женщине нельзя было, если шнур, пруты лежат, нельзя перешагивать, чтоб препятствий не было при родах, чтоб легко рожать. Нельзя было у порога стоять, через порог надо было быстро перешагивать, нельзя стоять у калитки, чтобы ребѐнок быстро родился. Нельзя было смотреть на некрасивых, чтоб родился красивый, на уродливых нельзя смотреть. Беременная женщина боялась, чтоб еѐ не сглазили» (запісана ў г. Гомель ад Котавай Наталлі Аляксандраўны, 1962 г. н.) [1, с. 165]. Задоўга да родаў цяжарнай жанчыне неабходна было шмат чаго асцерагацца ў жыцці: не працаваць у святочныя дні, не ствараць кругі ў вадзе пры паласканні бялізны на рэчцы, не дакранацца да твару: «Цяжарным раілі: не рабі ў святы, а то дзіця народзіш калекам. Як пойдзеш паласкаць на рэчку бялізну, не круці яе ў вадзе, а то будзе непаўнацэнны або пупавіна закруціцца. Не хапайся на пажары за твар рукамі, а то ў малога будзе радзімае пятно» (запісана у г. Гомель ад Маславай Кацярыны Архіпаўны, 1927 г. н.) [1, с. 167]. З мэтай засцярогі цяжарнай жанчыны прадугледжвалі такія сродкі, як апрананне кашулі навыварат, прышпільванне да адзення шпількі: «Звычайна на роженіцу і рабѐнка адзявалі рубаху наізнанку або на унутраную старану цаплялі булаўку» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Цуцуковай Проні Філіпаўны 1927 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Паводле сведчанняў бабулі аўтара дадзенага артыкула, забароны для цяжарнай жанчыны, прынятыя ў мясцовай традыцыі, нельга парушаць, інакш можна было нашкодзіць дзіцяці: «Нельзя ў празнікі царкоўныя рубаць, рэзаць, шыць, асобенна ў больных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэлігіозныя празнікі. Нельзя, еслі крыкне хто, прыкладаць рукі да грудзей. Нельзя не проста ў празнікі, а вабшчэ. Нельзя перагібацца, сільна накланяцца, каб не траўміраваць дзіцѐнка, очэнь многа ўвечый атрымліваецца для яго. Плахіх слоў нельзя было гаварыць пры бярэменнасці, гэта запрэшчано вабшчэ. Нельзя пінаць нагой парасѐнка, вабшчэ нічога пінаць нельзя. Стукаць рукамі таксама забаранялася» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Уніятавай Лідзіі Васільеўны 1946 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Зыходзячы з іншых звестак, здароўе немаўляці залежала і ад часу, калі жанчына зацяжарыла: «Нельзя бярэмененць у пост, строга забаранялася» 271 (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Клімянцѐнак Марыі Яфімаўны 1934 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Заслугоўваюць увагі звесткі пра тое, што трэба было рабіць, каб жанчына магла лягчэй нарадзіць: «Шоб лягчэй ражаць, трэба было многа маліцца не толькі парадзісе, але яшчэ і бабке, якая прымала роды. Нада было паадкрываць вокны, каб быў воздух» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Мальцавай Марыі Дзмітрыеўны 1934 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Важную ролю адводзілі кумам, выбар якіх быў звязаны з пэўнымі правіламі, якія перадаваліся ад пакалення да пакалення. Паводле народных вераванняў, з гэтымі людзьмі трэба быць у добрых адносінах, нельга было спрачацца: «З кумамі нельзя лаяцца. У празнікі асобенна, перад поснымі днямі – гэта серада і пятніца» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Уніятавай Лідзіі Васільеўны 1946 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Звычайна функцыю запрашэння быць кумамі выконваў бацька, які павінен прыйсці абавязкова з хлебам і гарэлкай, пры гэтым ѐн прамаўляў сваѐ запрашэнне, «стоячы, каб дзіцѐ хутка навучылася хадзіць» (запісана ў в. Сінічына Буда-Кашалѐўскага раѐна Гомельскай вобласці ад Васілеўскай Марыі Андрэеўны, 1930 г. н.) [1, с. 150]. Святкаванню хрэсьбін у народзе надавалася вялікая ўвага, асабліва запрошаным куму і куме, якіх выбіралі з ліку чужых людзей. Самае галоўнае да іх патрабаванне – клапаціцца ў будучым пра дзіця, якое яны пахрысцілі, не ўступаць адзін з адным у інтымныя адносіны: «Нада, каб кум забоціўся аб сваім хрэсніку, трэба, каб ѐн яго вучыў харошаму. Куму з кумой нельзя жаніцца» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Сяргеенка Еўдакіі Фѐдараўны, 1933 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Менавіта кум і кума – тыя важныя персанажы, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў абрадзе хрышчэння дзіцяці: «Мальчыка дзержыць хросны, а дзевачку трымае хросна» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Уніятавай Лідзіі Васільеўны, 1946 г. н., студэнткай Уніятавай К. В.). Бацькі нованароджанага запрашалі для выканання пэўных рытуалаў і бабку-павітуху. Яна прыносіла абавязкова на хрэсьбіны гаршчок з кашай, які трэба было выкупіць, а потым разбіць. Звычайна гэту ролю выконваў кум: «Кум павінен купіць гэтую кашу. Калі каша куплена, ею ўгашчаюцца ўсе госці. Калі кашу з‘елі, кум бярэ гаршок і разбівае яго аб вугал, а чарапкі даюцца незамужнім дзеўкам, а тыя, што астаюцца, баба сабірае і кідае ў вугал, прыгаворваючы: —Кідаю на кут, каб на будушчы год зноў быць тут » [1, с. 119]. Прывядзем яшчэ Фольклористика 272 адзін цікавы прыклад, як абыходзіліся з чарапкамі ад разбітага гаршка: «Асколкі (чарапкі) гаршка разам з кашай дзялілі ўсім. Замужнім дзеўкам кідалі іх у падол спадніцы ці хвартуха – сімвал перадачы ўрадлівасці ці пладавітасці, зерне – новае жыццѐ, каб хутчэй зацяжарнічаць» (запісана ў в. Маркавічы Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці ад Цуцуковай Проні Філіпаўны, 1927 г. н, студэнткай Уніятавай К. В.). Прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю і родамі жанчыны, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання гаршка з кашай даюць падставы для асэнсавання светапогляду нашых продкаў, разумення семантыкі абрадавых дзеянняў, звязаных з нараджэннем немаўляці і яго далучэннем да соцыуму. Спіс літаратуры 1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-ўкладальнікі В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыца, А. М Воінава, С. А. Вяргеенка., А. М. Палуян, А. У. Партнова-Шахоўская. – Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ